УДК 821.161.3:82-3*Ягоўдзік

Я. У. Кавальчук

Навук. кір. – Т. М. Пучынская, канд. пед. навук, дацэнт

# АЎТАБІЯГРАФІЗМ У АПОВЕСЦІ УЛАДЗІМІРА ЯГОЎДЗІКА «ВОЧЫ НАЧНІЦЫ»

Дадзены артыкул прысвечаны даследаванню аўтабіяграфічнага пачатку ў аповесці Уладзіміра Ягоўдзіка «Вочы начніцы». Аналізуюцца такія мастацкія асаблівасці твора, як лірызм у апавядальнай плыні, наяўнасць аповеду ад першай асобы, суаднесенасць вобраза галоўнага героя твора з жыццём аўтара, акцэнт на сталенні і развіцці характару персанажа. Зроблены вывад, што ў аповесці прынцып аўтабіяграфізму ў цэлым дамінуе і вызначае жанравую своеасаблівасць твора.
Сюжэтам для напісання аўтабіяграфічных твораў часта становяцца дзіцячыя і юнацкія гады пісьменніка. І гэта невыпадкова: уражанні пра раннюю пару жыцця асабліва яркія і запамінальныя. Тэма дзяцінства ў мастацкай літаратуры з'яўляецца ўніверсальнай і непаўторнай у яе жанравым і стылёвым выяўленні. Аўтабіяграфічная проза на тэму дзяцінства добра вядома чытачам (творы рускіх пісьменнікаў М. Г. Гарына-Міхайлоўскага, С. Ц. Аксакава, А. М. Талстога). У беларускай літаратуры вядомасць атрымала, напрыклад, аўтабіяграфічная аповесць Янкі Маўра «Шлях з цемры».

У дадзеным артыкуле ўвага скіравана на творчасць сучаснага пісьменніка У. Ягоўдзіка, аналізуецца прысвечаная тэме дзяцінства аповесць «Вочы начніцы», у творы выяўляецца аўтабіяграфічны пачатак. У навуковых выданнях змест паняцця «аўтабіяграфічны жанр» вызначаецца наступным чынам: «літаратурныя творы, у якіх аўтары прама ці ўскосна апісваюць уласнае жыццё» [1, с. 223]. Пад уплывам эстэтычнай апрацоўкі аўтабіяграфія ў большай або меншай ступені трансфармуецца, ператвараючыся ў мастацкі факт у творах іншых жанраў - апавяданнях, аповесцях, раманах [2]. Аповесць У. Ягоўдзіка «Вочы начніцы» паказвае складаны шлях сталення чалавека, гэта «…шчымліва-самотны твор пра маці, пра дзеда і бабулю, пра маленства і станаўленне характару. Яна была напісана на аснове асабіста перажытага, пранізана пачуццём тужлівага болю» [3]. У. Ягоўдзік - беларускі празаік, публіцыст, драматург, лаўрэат Прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, лаўрэат Літаратурнай прэміі імя Янкі Маўра. «Пісьменнік творыць свой мастацкі свет як уласны дом, у які не сорамна чытача запрасіць, дый і самому жыць наканавана, нешта дабудаваць, пашыраць, аздабляць, рапараваць…» [4]. У дзіцячым узросце Уладзімір Іванавіч перажыў страту бацькоў, вучыўся ў Дзятлаўскай, Слонімскай, Зэльвенскай школах-інтэрнатах: «З роднай вёскай Кастровічы яго часцей за ўсё звязвалі канікулы, куды з розных інтэрнатаў прыязджаў да свайго дзеда» [3]. У аповесці «Вочы начніцы» маляўнічыя краявіды роднай Слонімшчыны, вёска, бацькоўская хата становяцца аб'ектам мастацкага асэнсавання: «Захутанае ў светла-шэрыя пасмы неба хінулася да зямлі, чаплялася за вершаліны таполяў усцяж дарогі на Слонім, і раптам усміхалася лапікам блакіту» [5, с. 46]; «Пачаўся Слонім. Хаты, як у Валовічах, толькі ашаляваныя і пафарбаваныя ў вясёлыя колеры. З правага боку, перад стадыёнам, праплыла каплічка святога Дамініка…» [5, с. 47]. С. Чыгрын заўважае: «Шмат разоў перачытваю гэту аповесць Уладзіміра Ягоўдзіка і заўсёды перажываю разам з аўтарам, здаецца, бачачы праз акно сваёй хаты яго суседнія, зусім блізкія з маёй вёскай на Слонімшчыне, вёску Кастровічы. Усе вёскі-суседзі Уладзімір ведае, як кажуць, на памяць» [3]. У сваёй аповесці У. Ягоўдзік распавядае пра вёску Валовічы, а таксама ўзгадвае Жыровічы, Малашы, якія знаходзяцца на яго малой радзіме. «Уладзімір Ягоўдзік - прыродазнаўца. Усё жыццё ён любіць вёску» [3], пісьменнік вырас на ўлонні прыроды. Пазней гэты ўласны Литературоведение 64 вопыт ён перадасць наступнаму пакаленню, каб яно не блукала ў пошуку ісцін, а выкарыстоўвала ўжо набытае папярэднікамі. Магчыма, пісьменнік хацеў падзяліцца з чытачамі назіраннямі, думкамі і перажываннямі, якія ён адчуваў у стане самоты. У самым пачатку аповесці «Вочы начніцы» апісанне прыроды стварае трывожны настрой: «Іду паціху, азіраючыся вакол сябе… Калючы вецер

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

дзьме проста ў твар, пахне гаркавым попелам. Хачу і не магу паверыць, што праз тыдзень вясна» [5, с. 6]. Чытацкая насцярожанасць апраўдваецца: аўтар знаѐміць са сваім героем — хлопчыкам-падлеткам, які занепакоены хваробай маці. Адметнасцю твораў, у якіх прысутнічае аўтабіяграфічны пачатак, з‘яўляецца тое, што асоба аўтара становіцца прататыпам галоўнага героя. У аповесці «Вочы начніцы» У. Ягоўдзік выявіў некаторыя дэталі ўласнага жыцця, паказаў асаблівасці светапогляду ў вобразе Валерыка Літвінчука. Па словах С. Чыгрына, «найчасцей ѐн (Уладзімір Ягоўдзік) сѐння прыгадвае маці і дзеда. Мама часта хварэла, таму найбольш выхаваннем унука займаўся родны дзядуля» [3]. Валерык Літвінчук, галоўны герой твора, шмат перажыў у дзяцінстве: хвароба і смерць маці, сіроцтва, жыццѐ з бабуляй і дзядулем. Аўтар надзяляе героя рысамі свайго лѐсу і характару. Гэта, аднак, не гаворыць пра тое, што асоба пісьменніка і яго героя поўнасцю супадаюць, паколькі «Вочы начніцы» - гэта найперш мастацкі твор. Са шчымлівым болем успамінае У. Ягоўдзік сваю маці ў аповесці «І пазвала я…». Думкі пра маці не даюць аўтару забыць яе вобраз і ў аповесці «Вочы начніцы». У. Ягоўдзік апісвае пяшчотныя, напоўненыя любоўю і ласкай адносіны паміж маці і сынам: «Мамачка, ты прастудзішся... Падніміся, хадзем у хату...» [5, с. 7]. Аднак сыну і маці настаў час расстацца, бо паміж імі, іх шчырымі адносінамі з‘явілася хвароба. Апошняя сустрэча сына і маці ў бальніцы характарызуецца асаблівым драматызмам жыццѐвай сітуацыі: «Хутчэй вяртайся, мамачка», - прадчуваючы апошнюю сустрэчу прашаптаў Валерык» [5, с. 50]. Страціўшы самага блізкага чалавека, Валерык Літвінчук становіцца сіратою, яго выхаваннем займаюцца бабуля і дзядуля, якія імкнуцца атуліць хлопчыка цеплынѐй і клопатам. У творы Уладзіміра Ягоўдзіка вядзецца гаворка пра станаўленне асобы чалавека, пра адчуванні падлетка, які застаецца сам-насам з вялікім светам. Шасцікласнік Валерка Літвінчук адчувае на сабе ўсю складанасць свету, сутнасць узаемаадносін людзей. Большасць старэйшых людзей (дзед Павел і баба Наталля, хросная маці Ніна, 65 настаўніца малявання Марына Юр‘еўна) вучаць Валерку разуменню дабрыні, спагаднасці. Гэта аповесць з драматычным сюжэтам, нават трагедыйным, але ў цэлым пафас яе аптымістычны [6, с. 663]. Для твораў, у якіх прысутнічае аўтабіяграфічны пачатак, характэрна лірычная плынь. У прозе У. Ягоўдзіка яна вызначаецца ўзрушанай інтанацыяй, вядзеннем аповеду ад першай асобы, павышанай асацыятыўнасцю. Так, напрыклад, амяла, якую ў народзе называлі начніцай, становіцца «знакам бяды» для Валерыка і яго сям‘і. Гэта расліна, якая жывіцца сокам дрэва, таму яно засыхае і ўрэшце трапляе пад сякеру. У роспачы хлапчук размаўляе з дрэвам: «Не хавайся, выходзь на святло, Начніца! Я усѐ роўна пазнаў цябе. Няхай ты схавалася ў цемры сама, ды табе не схаваць трохкутных вачэй, што блішчаць жоўтым прагавітым агнѐм» [5, с. 142]. У творы герой становіцца цэнтрам усѐй кампазіцыі, якая ўяўляе сабой шэраг непасрэдных перажыванняў персанажа, Валерыка Літвінчука. У пачатку аповесці гэта хлопчык, які шукае дапамогі і падтрымкі ў вялікім свеце. Пераадольваючы абставіны жыцця, герой У. Ягоўдзіка паступова сталее, вучыцца самастойна жыць і працаваць. Аўтабіяграфізм у мастацкай літаратуры спрыяе самапазнанню асобы чалавека, свайго аўтарскага «я». Уяўленне сябе ў вобразе героя - гэта шэраг самаацэнак, рэфлексій. Аповесць У. Ягоўдзіка «Вочы начніцы» мае аўтабіяграфічны пачатак. Захоўваючы пэўную «дыстанцыю» паміж героем і аўтарам, пісьменнік імкнецца паказаць свой унутраны свет, найбольш значныя яго фрагменты, надаць ім асаблівую лірычную форму ў залежнасці ад свайго светапогляду. Спіс літаратуры 1 Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва: у 5 т. Т. 3: Карчма – Найгрыш / І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. - Мінск: БелСЭ, 1986. – 751 с. 2 Пучынская, Т. М. Аўтабіяграфізм у рамане Г. Марчука «Кветкі правінцыі» / Т. М. Пучынская // Специалист XXI века: материалы IV Междунар. науч.-практич. конф., 22 октября 2015 г. Барановичи, Респ. Беларусь / редкол.: А. В. Никишова (гл. ред.), А. А. Селезнев, А. В. Прадун (отв. ред.) [и др.]. - Барановичи: РИО БарГУ, 2015. - С. 264-266. 3 «Смутак матчын жаўранкам ляжыць…»: да 60-годдзя з дня нараджэння пісьменніка Уладзіміра Ягоўдзіка / С. Чыгрын // Наша слова. - 2016. - № 7. - С. 4. 4 Настроенасць на цуд: да 55-годдзя Уладзіміра Ягоўдзіка / П. Васючэнка // Пачатковая школа. - 2011. - № 2. - С. 64. 5 Ягоўдзік, У. Шчыраю ноччу / У. Ягоўдзік. - Мінск: Літаратура і Мастацтва, 2009. - 271 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Литературоведение 66 6 Беларуская дзіцячая літаратура: вучэб дапам. / А. М. Макарэвіч [і інш.]; пад агул. рэд. А. М. Макарэвіча, М. Б. Яфімавай. - Мінск : Выш. школа, 2008. - 688 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ